11. Хаям, У. Выбраныя рубаі / У. Хаям; пер. з фарсі-кабулі Р. Барадуліна. – Мінск: Зміцер Колас, 2016. – 88 с. – (Паэты планеты).

12. Хаям, А. Выбраныя старонкі / А. Хаям; [пер. Р. Барадуліна, В. Шніпа, Г. Аўласенкі]. – Мінск: Звязда, 2022. – 287 с.

13. Хаям, А. «Свет у табе, вакол цябе нічога»: [рубаі] / А. Хаям; пер. В. Шніп // Літ. і мастацтва. – 2021. – 21 мая (№ 20). – С. 10.

14. Багдановіч, М. Поўны збор твораў: у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды – 752 с.

15. Танк, М. Збор твораў: у 13 т. / М. Танк. – Мінск: Беларус. навука, 2008. – Т. 5. – 454 с.

16. Барадулін, Р. Збор твораў: у 5 т. / Р. Барадулін. – Мінск: Маст. літ., 1999. – Т. 3: Паэмы. Вершы. – 335 с.

17. Лужанін, М. Збор твораў: у 4 т. / М. Лужанін. – Мінск: Маст. літ., 1981. – Т. 3: Падарожныя нізкі; Вершы 1966–1973; Як нараджаўся новы свет; Рэпартаж з рубцом на сэрцы. – 511 с.

18. Янішчыц, Я. Дзень вечаровы: лірыка / Я. Янішчыц. – Мінск: Маст. літ., 1974. – 78 с.

19. Крупенька, Я. Юбілейныя бліны: гумар і сатыра / Я. Крупенька. – Мінск: Маст. літ., 1984. – 55 с.

20. Федарцова, Т. М. Асваенне беларускай версіфікацыяй цвёрдых вершаваных формаў: рубаі / Т. М. Федарцова // Міжнародныя Шамякінскія чытанні «Пісьменнік – Асоба – Час»: матэрыялы II Міжнар. навук.-практ. канф., Мазыр, 20–21 кастр. 2011 г. / Мазыр. дзярж. пед. ун-т; [рэдкал.: А. У. Сузько (адк. рэд.) і інш.]. – Мазыр, 2011. – С. 101–106.

21. Гоўзіч, І. М. Усходняя вершаваная форма рубаі ў творчасці М. Багдановіча і паэзіі другой паловы XX стагоддзя / І. М. Гоўзіч // Творчасць Максіма Багдановіча ў кантэксце сусветнай літаратуры: матэрыялы Міжнар. навук. канф. да 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча (Мінск, 25–26 лістап. 2011 г.) / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры; [рэдкал.: А. А. Манкевіч (уклад.) і інш.]. – Мінск, 2011. – С. 100–104.

22. Міклашэўскі, Я. Вершы / Я. Міклашэўскі // Маладосць. – 2000. – № 2. – С. 190–206.

23. Пракаповіч, І. «Мой Храм – Беларусь…»: [вершы] / І. Пракаповіч // Род. слова. – 1992. – № 11. – С. 74–75.

24. Буланда, В. Мне не жыць без цябе…: вершы / В. Буланда. – Барысаў: [б. в.], 1997. – 110 с.

25. Арашонак, А. [Вершы] / А. Арашонак // Першацвет. – 2001. – № 11. – С. 45.

26. Инь и ян [Электронный ресурс] // ВикипедиЯ. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/Инь_и_ян. – Дата доступа: 25.12.2022.

27. Дубянецкі, Э. Душы маёй няскончаны палёт: кніга паэзіі / Э. Дубянецкі. – Мінск: Кнігазбор, 2011. – 124 с.

28. Мінскевіч, С. Адвечны рэчытатыў: [вершы] / С. Мінскевіч // Дзеяслоў. – 2013. – № 2 (63). – С. 152–157.

29. Лебедзеў, У. Несціханае рэха: зб. паэзіі / У. Лебедзеў. – Брэст: Альтернатива, 2013. – 75 с.

30. Палынскі, А. [Рубаі] [Электронны рэсурс] / А. Палынскі. – Рэжым доступу: https://www.facebook.com/profile.php?id=1504090002. – Дата доступу: 10.03.2023.

31. Чарказян, Г. Чаргаві / Г. Чарказян; пер. з курд. М. Мятліцкага // Полымя. – 2007. – № 6. – С. 100–113.

32. Барадулін, Р. Вершатэрапія / Р. Барадулін // Дзеяслоў. – 2013. – № 2 (63). – С. 5–20.

33. Барадулін, Р. Халодная памяць вады / Р. Барадулін. – Мінск: Рым.-Катал. парафія св. Сымона і св. Алены, 2010. – 497 с.

34. Барадулін, Р. Карані цішыні… : [вершы] / Р. Барадулін // Дзеяслоў. – 2012. – № 1 (56). – С. 5–18.

35. Барадулін, Р. Шляхам бульбы: [вершы] / Р. Барадулін // Дзеяслоў. – 2013. – № 6 (67). – С. 5–15.

36. Марозаў, З. І жаўранка накцюрн у паднябессі…: вершы, санеты, вянкі санетаў / З. Марозаў. – Мінск: Чатыры чвэрці, 2021. – 187 с.

## References

1. Ragoisha V. P. *Verse. Poetry: an encyclopedic guide*. Minsk, Belaruskaya Entsyklapedyya Publ., 2020. 471 p. (in Belarusian).

2. Kvyatkovskii A. P. *Poetic dictionary.* Moscow, Sovetskaya Entsiklopediya Publ., 1966. 375 p. (in Russian).

3. Rubaʿi. *WikipediA.* Available at: https://en.wikipedia.org/wiki/Ruba%CA%BFi (accessed 22.12.2022).

4. *Poetry of the East.* Moscow, Slovo Publ., 2010. 645 p. (in Russian).

5. Gubaidulina S. A. "Rubaiyat". *Musical seasons*. Available at: https://musicseasons.org/sofiya-asgatovna-gubajdulina-rubajyat/ (accessed 20.12.2022) (in Russian).

6. Sadokhin A. P. *Culturology: theory and history of culture*. Moscow, Eksmo Publ., 2007. 623 p. (in Russian).

7. Braginskii I., Komissarov D. *Persian literature.* Moscow, Publishing house of East literature, 1963. 213 p. (in Russian).

8. Ragoisha V. P., Ken'ka M. P., Marozava T. A. *Introduction to literary studies. Part 2. Poetics. Theory of literary research* process. Minsk, Belarusian State University, 2012. 239 p. (in Belarusian).

ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

## *ПРАВА*

## *LAW*

УДК 342.571
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2024-69-3-241-249

Поступила в редакцию 14.11.2023
Received 14.11.2023

**И. В. Шахновская**

*Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой, Новополоцк, Беларусь*

# ТРАНСФОРМАЦИЯ ИНСТИТУТА МЕСТНОГО САМОУПРАВЛЕНИЯ В УСЛОВИЯХ ЦИФРОВИЗАЦИИ: ОПЫТ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ И РОССИЙСКОЙ ФЕДЕРАЦИИ

**Аннотация.** Рассматриваются особенности и принципы деятельности местного самоуправления в цифровую эпоху. Анализируются организационно-правовые формы деятельности местного самоуправления в Республике Беларусь и Российской Федерации. Отдельное внимание уделяется конституционной реформе местного самоуправления в Российской Федерации в 2020 г. Рассматривается содержание принципов цифровизации, транспарентности, гласности, информационной открытости в деятельности органов местного самоуправления, определяются основные задачи цифровизации местного самоуправления. Автор уделяет внимание негативным аспектам цифровизации местного самоуправления, в частности, обосновывает позицию о тенденции сближения органов местного самоуправления и государственной власти, акцентирует внимание на отсутствии критерия вовлеченности населения в управление местными делами при проведении оценки цифрового развития регионов. Анализируется типовая Концепция развития «умных городов» в Республике Беларусь, положительно оценивается контент мобильного приложения «Мой город». Рассматриваются перспективные направления развития местного самоуправления в условиях цифровизации, обосновываются предложения по совершенствованию законодательства. Высказываются идеи относительно развития института местных электронных собраний, оценки деятельности органов местного самоуправления с помощью цифровых технологий, проведения трансляций заседаний местных Советов и др.

**Ключевые слова:** цифровизация, местное самоуправление, «умный город», цифровое развитие, местные Советы, онлайн-трансляции, перспективы развития

**Для цитирования:** Шахновская, И. В. Трансформация института местного самоуправления в условиях цифровизации: опыт Республики Беларусь и Российской Федерации / И. В. Шахновская // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2024. – Т. 69, № 3. – С. 241–249. https://doi.org/10.29235/2524-2369-2024-69-3-241-249

**Irina V. Shakhnovskaya**

*Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk, Novopolotsk, Belarus*

# TRANSFORMATION OF THE INSTITUTION OF LOCAL SELF-GOVERNMENT IN THE CONDITIONS OF DIGITIZATION: EXPERIENCE OF THE REPUBLIC OF BELARUS AND THE RUSSIAN FEDERATION

**Abstract.** The article discusses the features and principles of local government in the digital era. The organizational and legal forms of activity of local self-government in the Republic of Belarus and the Russian Federation are analyzed. Special attention is paid to the constitutional reform of local self-government in the Russian Federation in 2020. The content of the principles of digitalization, transparency, publicity, information openness in the activities of local government bodies is considered, and the main tasks of digitalization of local government are determined. The author pays attention to the negative aspects of digitalization of local self-government, in particular, he substantiates the position on the trend of convergence between local self-government and state authorities, and focuses on the lack of a criterion for the involvement of the population in the management of local affairs when assessing the digital development of regions. The standard Concept for the development of smart cities in the Republic of Belarus is analyzed, and the content of the "My City" mobile application is positively assessed. The article examines promising directions for the development of local self-government in the context of digitalization, and substantiates proposals for improving legislation. Ideas are expressed regarding the development of the

© Шахновская И. В., 2024

Апошняя частка «Палескага дзівасілу» «Сакрэты мастацкага стылю» – лагічнае завяршэнне разважанняў аўтараў аб мастацкім метадзе У. В. Гніламедава, што вызначаецца імі як новы рэалізм і асаблівасці яго індывідуальна-аўтарскага стылю, сярод якіх найбольш істотнымі называюцца арыгінальная наратыўная стратэгія, аўтабіяграфізм і дакументалізм, майстэрства мастацкай дэталі і выкарыстання этнаграфічнага матэрыялу. Усё гэта разам узятае дазваляе пагадзіцца з тым, што «сямейна-гістарычная хроніка У. Гніламедава, у якой глыбока асэнсоўваецца беларускі нацыянальны характар у пераломныя моманты гісторыі, ужо стала самай значнай з'явай сучаснага літаратурнага працэсу і сведчаннем таго, што імкненне да рэалістычнай эпічнай маштабнасці – істотная тэндэнцыя развіцця сучаснай беларускай прозы» (с. 179).

У пасляслоўі да кнігі В. Русілка выказвае меркаванне, што ў першую чаргу яна будзе цікавая філолагам, але дазволю сабе паспрачацца з аўтарам. Упэўненая, што «Палескі дзівасіл» будзе цікавы не толькі спецыялістам, але і далёкім ад навукі і адукацыі чытачам, тым, каго натхняе беларуская гісторыя, усім аматарам роднага слова, а таксама тым, хто проста марыць пазнаёміцца з выдатным чалавекам, нашым сучаснікам, якім, бясспрэчна, з'яўляецца У. В. Гніламедаў, няхай сабе гэтае знаёмства і будзе толькі завочным.

Пісаць пра сучаснікаў і сучаснасць складана, пісаць жа пра тых, да каго адчуваеш выразную цеплыню і глыбокую павагу, яшчэ складаней: лёгка аказацца суб'ектыўным, аднабаковым. Аднак аўтарам «Палескага дзівасілу» В. І. Локун і В. І. Русілка ўдалося ажыццявіць практычна немагчымае: распавесці пра Уладзіміра Васільевіча Гніламедава глыбока, аб'ектыўна, прачула, пераканаўча, не ўпадаючы ў славаслоўе, і распавесці так, што вобраз выдатнага вучонага і таленавітага пісьменніка не засланіў сабою вобраз цікавага, самабытнага чалавека, грамадзяніна, патрыёта, асобы, якая думае, мысліць, дзейнічае, стварае.


### Информация об авторе

**Развадовская Наталия Анатольевна** – кандидат филологических наук, доцент кафедры белорусской и зарубежной литературы. Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка (ул. Советская, 18, 220070, Минск, Республика Беларусь). E-mail: raznat2003@yandex.by

### Information about the author

**Natalia A. Razvadovskaya** – Ph. D. (Philol.), Associate Professor of the Department of Belarusian and Foreign Literature. Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank (18 Sovetskaya Str., Minsk 220070, Belarus). E-mail: raznat2003@yandex.by

ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

Паступіў у рэдакцыю 28.02.2024
https: //doi.org/10.29235/2524-2369-2024-69-3-256-259 Received 28.02.2024

**В. І. Русілка**

*Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава, Віцебск, Беларусь*

# КНІГА, ЯКУЮ ХОЧАЦЦА ЧЫТАЦЬ І ПЕРАЧЫТВАЦЬ[1]

Ёсць асобы, ролю якіх у развіцці айчыннай, ды і сусветнай, літаратуры нельга пераацаніць. Да іх творчасці, як да жыватворнай крыніцы, пастаянна звяртаюцца і навукоўцы, і крытыкі, і чытачы. І ёсць добрыя, нават узнагароджаныя высокімі званнямі пісьменнікі, пра якіх літаратуразнаўцы напішуць адно-два манаграфічныя даследаванні (часцей тыя, хто збіраецца абараняць кандыдацкую дысертацыю) і страчваюць сваю ўвагу да іх. А навошта, калі ўсё ясна, калі спрэчак ніякіх, калі творчая індывідуальнасць па-за дынамікай літаратурнага працэсу і кнігі не цікавяць больш чытача (хіба пад прынукай школьнага настаўніка літаратуры?). Не буду называць прозвішчаў, каб нікога не пакрыўдзіць, але ж дасведчаны чытач і сам ведае, пра каго мы ахвотна пішам (як пра У. Караткевіча, В. Быкава, А. Разанава, да прыкладу), а пра каго ветліва маўчым.

Максім Танк яўна адносіцца да тых, чыя дзейсная прысутнасць у сучаснай літаратуры неаспрэчная. Ён сцвердзіў у беларускай паэзіі магутную і найбольш перспектыўную сёння стылявую плынь, арыентаваную на агульнакультурную гуманістычную спадчыну, – інтэлектуальна-заглыбленае, асацыятыўна-ўмоўнае асэнсаванне жыцця ва ўсёй шматстайнасці яго праяў. Калі яшчэ гадоў дваццаць таму можна было пералічваць імёны наступнікаў (А. Вярцінскі, П. Макаль, А. Разанаў), то зараз большая частка паэзіі, асабліва маладой, развіваецца ў рэчышчы танкаўскай традыцыі (хоць можа, і не ўсведамляючы гэтага), падключаючыся да яе найперш праз верлібр і ўласцівую яму ўмоўную, сканцэнтраваную да знака вобразнасць, якая абуджае інтэлект чытача. Глабальныя культурныя працэсы, суцэльная і безальтэрнатыўная камп'ютарызацыя вымагаюць менавіта такой паэзіі.

Вядома, Максім Танк – гэта найперш верлібр, які, зазначым, быў уласцівы паэту яшчэ ў пачатку трыццатых гадоў мінулага стагоддзя. Аднак паэт абсалютна натуральна пачуваў сябе і ў класічным меладычным вершы, і ў "цвёрдай" форме санета, пасмейваючыся, праўда, з гэтай цвёрдасці ("Антысанет"), і ў паэтычным пераасэнсаванні фальклорных сюжэтаў, прыказак і прымавак. У вобліку паэта захапляе і ўражвае маштабнасць і суладдзе духоўнага свету, у якім на роўных дэталь і высокая ідэя ("буслянка побач з Богам"), цесная зрошчанасць умоўна-абстрактнага і канкрэтна-рэчыўнага планаў, касмічнасць і адначасова заземленасць думкі. І яшчэ вельмі імпануе мяккі, дасціпны і інтэлігентны гумар і самаіронія, якой падсвечаны ці не кожны твор паэта. Шматграннасць творчай індывідуальнасці Максіма Танка і падпітвае, сілкуе нязменную ўвагу да яго паэтычных набыткаў: пра паэта напісаны сотні артыкулаў і ажно чатырнаццаць (!) манаграфій самых аўтарытэтных ў беларускім літаратуразнаўстве аўтараў: В. Рагойшы, М. Арочкі, Дз. Бугаёва, У. Калесніка, А. Вераб'я і інш. Актуальнасць і сучаснасць танкаўскай паэзіі пацвярджаецца тым, што толькі за апошнія дзесяць гадоў пра яго выйшлі дзве змястоўныя, цікавыя і абсалютна не падобныя адна да адной кнігі С. Калядкі і Л. Дранько-Майсюка.

Асобнае месца ў пераліку даследаванняў творчасці Максіма Танка займаюць кнігі Міколы Мікуліча: "Максім Танк і сучасная беларуская лірыка" (1994), "Максім Танк: на скразняках стагоддзя" (1999), "Паэзія рэчаіснасці: у свеце Максіма Танка" (2001), "Максім Танк: талент, заручаны з небам" (2012). У кожнай з папярэдне выдадзеных кніг М. Мікулічу ўдавалася пазбегнуць паўтарэнняў, знаходзячы новы ракурс даследаванняў: у большай ступені звяртаючыся ці да тэк-

[1] Мікуліч, М. У. Максім Танк. Асоба, паэзія, лёс / М. Мікуліч; навук. рэд.: У. В. Гніламедаў. – Мінск: Беларус. навука, 2023. – 499 с. У далейшым спасылкі на гэтае выданне з указаннем у дужках старонак.

© Русілка В. І., 2024

стуальнага аналізу твораў, ці да вызначэння адметнасцей стылю паэта, ці да яго стылеўтваральнага ўплыву на творчасць сучасных беларускіх паэтаў. Як бачым, новая кніга М. Мікуліча – гэта яго пятае манаграфічнае даследаванне пра Максіма Танка, таму, ніколькі не сумняваючыся ў выключнай дасведчанасці і прафесіяналізме аўтара, адразу ж задаеш сабе пытанне: што новага можна было знайсці, што новага можна было сказаць? Уважлівае чытанне цікавай і змястоўнай кнігі пераконвае: вельмі многа новага і нават нечаканага. Але аб усім па парадку.

У першай з трох асноўных частак даследавання, названай удалай і дарэчнай цытатай з Максіма Танка “Растуць шляхі і крылы…”, М. Мікуліч з уласцівай яму глыбінёй і навуковай значнасцю аналізу прасочвае дынаміку станаўлення творчай асобы Максіма Танка, яго мастацкі вопыт на працягу розных жыццёвых этапаў у багатым кантэксце літаратурнага працэсу, уплыў паэта на развіццё нацыянальнага прыгожага пісьменства. Значнасць прадмета вызначае і аб’ём гэтай галоўнай часткі, якая дзеліцца на 12 раздзелаў, што ў храналагічнай паслядоўнасці прадстаўляюць чытачу асаблівасці фарміравання індывідуальнага стылю мастака. З першых старонак кнігі, нават яшчэ з уступу, уражваюць трапнасць, глыбіня і афарыстычнасць фармулёвак, якія тут жа хочацца цытаваць: творчасць М. Танка “вызначаецца арганічным спалучэннем маштабнасці гістарычнага мыслення, шырыні духоўна-сацыяльных абсягаў і пластыкі прадметнага аналізу, прыватнай канкрэтыкі з’яў і рэчаў… Індывідуальны стыль М. Танка сінтэзуе ў сабе адзнакі выразнага сілагічнага роздуму, аўталагічнага пісьма і яркіх умоўна-асацыятыўных карцін і малюнкаў, формаў унутрана сабранага, традыцыйнага верша і дольніка, верлібра, якія абумоўлены напружанымі пошукамі мастака ў галіне паэтычнай версіфікацыі. Яго развіццё забяспечвалі актыўны рух і абнаўленне паэтыкі, асаблівасці сімволіка-алегарычнага дыскурсу, лірыка-рамантычнай экспрэсіўнасці, насычанага рытміка-інтанацыйнага гучання верша” (с. 10).

Аднак жа высокі навуковы ўзровень даследавання ў манаграфіях М. Мікуліча не навіна, а звычная з’ява. Што для мяне было новым, дык гэта яўная асабістая прысутнасць аўтара, лірызм у спалучэнні з акадэмізмам, уласцівы новай кнізе ўвогуле, непрыхаваная шчырая любоў да паэта, якая адчуваецца і тады, калі даследчык гаворыць пра М. Танка як пра цудоўнага чалавека, і ў падрабязным далікатным тэкстуальным аналізе твораў. Літаратуразнаўцы прывыклі лоўка разрываць верш на цытаты, выбіраючы сабе зручнае і не думаючы пра тое, што парушаюць мастацкую цэласнасць твора, што вобраз сам па сабе не існуе. У дачыненні да вершаў М. Танка гэта асабліва важна. М. Мікуліч не баіцца цытаваць творы цалкам, і гэта павышае пераканальнасць аналізу, павялічваючы разам з тым аб’ём кнігі (так, гаворка пра вядомы, класічны верш “Песня кулікоў” займае тры старонкі, хоць якраз гэты тэкст, у адрозненне ад іншых, не такіх вялікіх, падаецца ўсё ж з невялікімі скарачэннямі).

А ў дачыненні да хрэстаматыйнага “Ave, Maria” што ўжо новага можна было сказаць? Вопыт М. Мікуліча пераконвае: можна, калі прааналізаваць гэты верш у параўнанні з пазнейшым “Фудзіяма”. Ад такіх унутраных паралеляў даследаванне індывідуальнага стылю М. Танка толькі выйграе, а іх у кнізе нямала.

Разам з тым у асобных выпадках цытаванне выглядае празмерным. Так, справядліва адзначаючы “голую адналінейнасць” і “ружова-рамантычную апісальнасць” (с. 125) у вершы М. Танка “Мінула дзесяць год”, даследчык мог бы і не прыводзіць твор цалкам (32 радкі слабага тэксту ўсё ж, і так паверылі б).

Акрамя арыгінальнага тэкстуальнага аналізу вершаў, дасведчанага чытача зацікавіць і той факт, што эвалюцыя пісьменніка (трыццатыя гады мінулага стагоддзя, да прыкладу) падаецца не толькі на аснове пазнейшых манаграфій слынных літаратуразнаўцаў, а з цытаваннем ацэнак, дарэчы, не заўсёды станоўчых, яго сучаснікаў. Калі б не М. Мікуліч, то я ды і многія нічога не ведалі б пра ацэнкі творчасці М. Танка ў артыкулах С. Каліны, А. Станкевіча, А. Бужанскага і інш. А такі падыход сведчыць пра вялікую архіўную працу аўтара манаграфіі, пра яго прафесіяналізм і дасведчанасць.

Надаючы немалую ўвагу станаўленню творчай індывідуальнасці М. Танка ў яго ўзаемаадносінах з польскай “Авангардай”, М. Мікуліч уступае ў навуковую палеміку з доктарам філалагічных навук Г. Тычко. Чытач сам вызначыць, які з пунктаў гледжання яму блізкі, я ж зазначу,

што аргументаваная палеміка заўсёды карысная як для абодвух бакоў, так і для літаратуразнаўства ў цэлым. Яе так не хапае нашым сучасным даследаванням.

Палемічны запал увогуле з'яўляецца адметнай рысай новай кнігі М. Мікуліча, аўтар шчыра імкнецца абараніць любімага пісьменніка ад неразумення і пустых папрокаў (палеміка з С. Хмарам, нязгода з А. Карпюком, Я. Брылём, Л. Арабей, якія папракалі М. Танка ў нерашучасці). Забягаючы наперад, скажу, што найбольш пераканальны і эмацыянальны М. Мікуліч у палеміцы з В. Адамчыкам, апублікаванай у трэцяй частцы кнігі. Як вядома, знаны празаік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі ў сваіх дзённікавых запісах без ніякіх аргументацый і доказаў абвінавачваў знакамітага паэта ў тым, што ён нібыта спісаў свае "Лісткі календара", дзённікавыя нататкі заходнебеларускага перыяду, з «Цатаеўскага віленскага "Slowa"», з публіцыстычных артыкулаў вядомага польскага публіцыста, гісторыка і грамадска-палітычнага дзеяча міжваеннага перыяду С. Цата-Мацкевіча. М. Мікуліч аргументавана і доказна аспрэчвае "сфармуляваны на ўзроўні нядобразычлівага падазрэння і толькі" папрок В. Адамчыка, палемізуе з пісьменнікам па іншых яго легкадумных выказваннях і заключэннях, якія зневажаюць асобу выдатнага паэта, грамадскага і дзяржаўнага дзеяча. Даследчык слушна адзначае, што мы сёння шмат гаворым пра захаванне гістарычнай памяці беларусаў, наогул памяці пра мінулае, праўду падзей і фактаў. Гістарычная памяць – гэта не толькі аснова нацыянальна-патрыятычнай адукацыі і духоўна-маральнага выхавання моладзі, але і ўсёй жыццядзейнасці народа. Захаванне светлай памяці пра Максіма Танка і ўсё зробленае ім для Беларусі і яе народа з'яўляецца нашым святым грамадзянскім абавязкам.

Безумоўную цікавасць выклікаюць пададзеныя даследчыкам удакладненыя факты біяграфіі М. Танка, звесткі (у тым ліку і трагічныя) пра яго блізкіх і самога паэта як пра выключна сціплага і прыгожага душой чалавека. М. Мікуліч, які многія гады добра ведаў паэта і сябраваў з ім, мае права сказаць: "Думаецца, якраз сінтэз рэдкага чалавечага характару і яркага мастацкага таленту, а таксама ўнікальнай жыццёвай біяграфіі абумовіў вялікія творчыя здабыткі Максіма Танка" (с. 131).

Адзінаццаты раздзел першай часткі кнігі, "Максім Танк і сучасная беларуская паэзія", стварае пераканальную панараму жывога літаратурнага працэсу, у якім уплыў класіка на сваёй творчасці адчуў ледзь не кожны з вядомых паэтаў, хто на ўзроўні тыпалагічнай блізкасці, хто – агульных стылістычных прыёмаў. Прааналізаваўшы творчасць не аднаго дзясятка беларускіх паэтаў, ад У. Караткевіча да зусім маладых В. Смолкі і В. Нікіценкі, М. Мікуліч мае права зрабіць вывад: "М. Танк з'яўляецца заснавальнікам у нашай нацыянальнай літаратуры сваёй духоўна-філасофскай школы, заканадаўцам у шмат якіх мастацка-стылявых і ўласна паэзіятворчых адносінах" (с. 223).

Шмат цікавых звестак змяшчае і самы асабісты, апошні раздзел першай часткі, які мае назву "Падчас сумоўя з паэтам": што расказваў М. Танк пра апошні дзень жыцця Янкі Купалы, пра заходнебеларускую рэчаіснасць, развагі пра беларускую мову. Сёння гэтыя звесткі толькі павялічваюць сваю каштоўнасць.

Зусім нечаканы аспект даследаванню надае невялікая, але вельмі змястоўная другая частка, "У рускіх перакладах", якая выяўляе высокую кваліфікацыю аўтара як перакладазнаўцу. Справа ў тым, што звычайна даследчыкі абмяжоўваюцца канстатацыяй факта перакладаў, іх пералікам. М. Мікуліч кваліфікавана і тонка аналізуе адпаведнасць перакладаў арыгінала, звяртаючы ўвагу як на ідэйна-вобразныя асаблівасці твораў, так і на іх рытміку, кампазіцыю, мелодыку, падтэкст. У полі зроку аўтара кнігі было больш за 50 перакладчыкаў. Пераканальна паказаны як удалыя пераклады (А. Пракоф'ева, Б. Ірыніна, У. Раждественскага, В. Тараса і інш.), так і асобныя няўдачы такога вядомага перакладчыка, як Я. Хелемскі. І, безумоўна, цікава даведацца, як сам М. Танк ставіўся да гучання сваіх вершаў на рускай мове.

Змястоўнай і арыгінальнай атрымалася і трэцяя частка даследавання, якая мае назву "У варунках гісторыка-літаратурнага працэсу і грамадскага жыцця" і прысвечана грамадскай і прафесійнай дзейнасці М. Танка, яго ўзаемаадносінам з калегамі, настаўнікамі і школьнікамі, роднымі і блізкімі, нават выпадковымі малазнаёмымі людзьмі, якія нярэдка звярталіся да яго па дапамогу. Разнастайны фактычны матэрыял, размешчаны ў сямі раздзелах, дадае новыя цікавыя

і пазнавальныя штрыхі як да прывабнага вобліку М. Танка, які заўсёды адгукаўся на звароты да яго, так і да партрэтаў многіх вядомых беларускіх літаратараў (асабліва ўразілі мяне старонкі пра таленавітага рускамоўнага паэта Ю. Фатнева). Багатае ліставанне (некаторыя лісты М. Танка, прыведзеныя М. Мікулічам, нават не ўвайшлі ў трынаццаты том збору твораў) робіць пераканальнай неаднаразова паўтараную думку даследчыка аб чалавечнасці і ўнікальнай прыгажосці асобы паэта. Цікава, што тэксты падаюцца без скарачэнняў і з захаваннем аўтарскай, часам вельмі недасканалай, арфаграфіі, што ўзмацняе эфект гістарызму і сапраўднасці.

І на заканчэнне пра тое, пра што думаеш з першых секунд знаёмства з кнігай. Як жа прыгожа, дыхтоўна, з якой павагай да чытача і да прадмета даследавання яна выдадзена! Не часта сустрэнеш такое сярод навуковых выданняў! Выдатная вокладка, якую робяць унікальнай фатаграфіі падпісаных рукой М. Танка канвертаў з лістамі да М. Мікуліча, шматлікія ілюстрацыі, фотаздымкі з асабістых архіваў і з фондаў шматлікіх музеяў і сховішчаў, аўтограф завяшчання, малюнак рукі паэта, якая своеасабліва благаслаўляе кнігу ў свет… Нават за іменны паказчык, які робіць чытанне вялікай кнігі зручнейшым, чытач будзе аўтару ўдзячны. Похапкам гэтую манаграфію не прачытаеш: 500 старонак вялікага фармату і якаснай паперы, таму трэба абавязкова сесці за рабочы стол, прывесці ў парадак думкі, уключыць камп'ютар ці ўзяць у рукі кнігу і атрымаць асалоду ад годнага твора таленавітага, выдатнага даследчыка пра вялікага нацыянальнага паэта, з якім ён сябраваў, якога глыбока паважае і любіць.

**Информация об авторе**

**Русилко Ольга Ивановна** – кандидат филологических наук, доцент, доцент кафедры литературы. Витебский государственный университет имени П. М. Машерова (Московский пр., 33, 210038, Витебск, Республика Беларусь). E-mail: rusilka@tut.by

**Information about the author**

**Volga I. Rusilka** – Ph. D. (Philol.), Associate Professor, Associate Professor of the Department of Literature. Vitebsk State University named after P. M. Masherov (33 Maskouski Ave., Vitebsk 210038, Belarus). E-mail: rusilka@tut.by

ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

## *ВУЧОНЫЯ БЕЛАРУСІ*

### *SCIENTISTS OF BELARUS*

Паступіў у рэдакцыю 23.04.2024
https: //doi.org/10.29235/2524-2369-2024-69-3-260-264 Received 23.04.2024

# СЦЯПАН СЦЯПАНАВІЧ ЛАЎШУК
## (Да 80-годдзя з дня нараджэння)



Кожны раз, калі прыходзіш у кабінет да Сцяпана Сцяпанавіча Лаўшука, у яго пад рукой на прасторным, дыхтоўным стале, заваленым самымі рознымі матэрыяламі, ляжыць “дзяжурны” аркуш фармату А4, спісаны акуратным, роўным почыркам, які прынята называць уборыстым. Гэтае азначэнне ў нашым выпадку найбольш дарэчнае яшчэ і таму, што яно датычыцца не толькі самога почырку, але і думак, ім выкладаных: яны маюць насычаную канцэнтрацыю і чэпкасць логікі. Між тым філалогіі ў рацыянальнасці нярэдка адмаўляюць, абмяжоўваючы яе толькі эстэтычнай ацэначнасцю. Навуковыя працы С. С. Лаўшука даказваюць гарманічнае спалучэнне абодвух аспектаў – ratio і perceptio. Іх сімбіёз у выпадку сёлетняга юбіляра доўжыцца больш чым паўвека.

Нараджэнне С. С. Лаўшука прыпала на першае лета пасля нямецка-фашысцкай акупацыі яго роднага кута – 28 ліпеня 1944 г. У сям’і чыгуначнага майстра ў мястэчку Васілевічы з’явілася на свет пятае дзіця – сын, якога, як і бацьку, назвалі Сцяпанам.

Далей была школа – спярша сямігодка, затым сярэдняя школа № 2 г. Васілевічы, што цікава – рускамоўная. Хлопчыку вучылася лёгка. Ужо тады ён раскрыў свае шматгранныя задаткі. Разам з тым праявілася і цяга да прыгожага пісьменства. У вучнёўскай сценгазеце час ад часу сталі з’яўляцца яго вершы. Тым не менш навучанне на рускай мове не адвярнула ад роднай. Таму на парозе самастойнага жыцця (атэстат сталасці быў атрыманы ў 1961 г.) асаблівых ваганняў хіба не было – толькі філалагічны факультэт.

У 1962 г. Сцяпан Сцяпанавіч становіцца студэнтам вядучай вышэйшай установы БССР – Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Не апошняй кропляй пры выбары філалогіі стала сустрэча на старонках адносна новага літаратурнага часопіса “Маладосць” з прозаю тады пачынаючага пісьменніка-земляка, будучага акадэміка і народнага пісьменніка Івана Навуменкі. Гэты выпадак задаў пэўную лёсавызначальную арыенціроўку. Абраная спецыяльнасць – журналістыка. Неўзабаве студэнт асвойтаўся і адчуў, што яму больш па душы. У выніку ён перавёўся на аддзяленне беларускай мовы і літаратуры.

Заканчэнне Сцяпанам Сцяпанавічам БДУ прыпала на 1967 г. Выпускнік не пазарыўся на магчымасць лягчэйшага шляху працаўладкавання (напрыклад, у сталіцы, што для лепшых выпускнікоў, да якіх адносіўся і С. С. Лаўшук, не сталася б вялікай праблемай) і паехаў у глыбінку. Ён быў накіраваны на Палессе. Але не зусім у свой бок – трохі заходней, у Лунінецкі раён. Такая неабходнасць мелася на дзяржаўным узроўні. Але тое не пярэчыла тагачасным трэндам сярод моладзі, запачаткаваным Лабановічамі першай паловы XX ст. Там для настаўніка беларускай мовы і літаратуры роднымі сталі вёскі Лахва, Дзятлавічы і Бродніца.

Нягледзячы на тое, што маладому чалавеку вельмі палюбіліся мясціны, тым больш яго заўважылі і ён пачаў імкліва прасоўвацца па службовай лесвіцы (стаў намеснікам дырэктара

© Трафімчык А. В., 2024

школы, пасля дырэктарам, рос па камсамольскай лініі), усё ж пераважылі ўнутранае жаданне да творчай самарэалізацыі і перадусім цяга да навуковых даследаванняў. Таму ў 1970 г. С. С. Лаўшук паступае ў аспірантуру Інстытута літаратуры Акадэміі навук БССР. Гэтае месца працы ён ужо не пакіне ніколі: пачаўшы з пасады малодшага навуковага супрацоўніка, дарасце да галоўнага, у працэсе займаючы ў тым ліку кіруючыя пасады.

Трохі парадаксальна сёння выглядае захопленасць правінцыяльнага паляшуцкага нашчадка тэатральным дзействам. Але тое не павінна бянтэжыць: у тыя часы мастацтва Мельпамены пранікала ў самыя глухія куткі праз аматарскія (клубныя і школьныя) калектывы і – самае галоўнае – знаходзіла шчыры і гарачы водгук у сэрцах народных мас.

Таму і выбар тэмы дысертацыйнага даследавання абумоўліваўся з улікам душэўных прыярытэтаў. У выніку кандыдацкая дысертацыя пад назвай “Праблемы сучаснай беларускай драматургіі (канфлікты і характары)” была паспяхова абаронена ў 1974 г. – ужо на наступны год пасля заканчэння навучання ў аспірантуры, што з’яўляецца вельмі высокім паказчыкам.

Наколькі складана было праводзіць названае даследаванне, сведчыць факт адсутнасці ў беларускай літаратуразнаўчай навуцы даследчыкаў, якія б удзялялі сістэмную ўвагу такому сінкрэтычнаму роду мастацкай літаратуры, як драматургія. Але роля першапраходца не толькі не палохала даследчыка, а, напэўна, падштурхоўвала, каталізавала, клікала ісці наперад. Адсюль і няўрымслівасць, імпэт і валявая ўпартасць – рысы, якія адчуваюцца пры вывучэнні творчасці ўжо самога С. С. Лаўшука.

З першага артыкула (1972) малады даследчык абазначыў, што пайшоў шляхам вырашэння вострых праблем. Пра гэта сведчыць яго назва – «Большая проблема “малых театров”». Аўтар ставіў пытанне пра забеспячэне самадзейных і правінцыяльных тэатральных калектываў рэпертуарам – і ў колькасным, і ў якасным аспектах.

Першы крок у навуковых выданнях быў зроблены на старонках акадэмічнага часопіса “Весці АН БССР” (1973, № 4). Знамянальна, што датычылася публікацыя (“Узмужненне жанру”) тэорыі бесканфліктнасці, рэшткі якой часам выяўляліся “ў творчай практыцы асобных драматургаў”. У артыкуле аналізуецца няпростая эвалюцыя камедыйнага жанру ў беларускай літаратуры, лепшыя здабыткі якой, як высвятляе аўтар, паставілі айчынную драматургію на сусветны ўзровень.

У далейшым даследчыцкія тэматычныя далягляды толькі пашыраліся. У поле зроку трапілі праблемы жанру, характараў і канфлікту, тэматыка і, натуральна, ідэйная інтэнцыянальнасць п’ес. Прычым як літаратуры класічнай (у першую чаргу творы Янкі Купалы і Кандрата Крапівы), так і актуальнага для пэўнага гістарычнага моманту мастацкага працэсу (п’есы Андрэя Макаёнка, Івана Мележа, Міколы Матукоўскага, Валянціна Зуба, Алеся Петрашкевіча і многіх іншых), драматургіі як прыгожага пісьменства, так і ўжо ўвасобленай на сцэне. Прычым праз аналітыку нават газетных публікацый С. С. Лаўшука праступае навуковая глыбіня, схільнасць да фундаментальных абагульненняў.

Галоўнае ж месца ў шэрагу некалькіх сот публікацый Сцяпана Сцяпанавіча займаюць, несумненна, яго навуковыя манаграфіі. Першай стала кніга на аснове дысертацыйнага даследавання “Сучасная беларуская драматургія”, якая ўбачыла свет у 1977 г. У той час і драматургія, і тэатр атрымалі вельмі інтэнсіўнае развіццё. Таму названая тэма стала запатрабаванай не толькі ў гуманітарных колах, але і грамадствам. Чаго варты тыраж – 2100 экземпляраў!

Такім чынам, станаўленне драматургазнаўца адбылося даволі імкліва і сведчыла ўжо тады пра з’яўленне ў гуманітарнай навуцы асобы таленавітай і неардынарнай, першыя працы кніжнага фармату сталі прадвеснікамі будучых буйных дасягненняў беларускай культуры. Дзякуючы перш за ўсё названай манаграфіі літаратара прымаюць у Саюз пісьменнікаў СССР (1982).

Новая кніга С. С. Лаўшука “Станаўленне беларускай савецкай драматургіі (20-я – пачатак 30-х гг.)” (1984) адлюстроўвала міжваенны перыяд, яркі, але і няпросты ва ўсіх сферах тагачаснага жыцця. Спецыялісты падкрэсліваюць, што даследаванне праведзена на вялікім фактычным матэрыяле, дзе побач з вядомымі імёнамі і творамі прысутнічаюць папулярныя, але да таго часу прызабытыя ці зусім не заўважаныя. Такі шырокі кантэкст дапамог даследчыку прасачыць сувязь з папярэднім этапам развіцця айчыннай драматургіі і прадвызначыць шляхі яе далейшай эвалюцыі. Акрамя таго, паралельна разглядалася станаўленне нацыянальнага тэатра.

Прынцыпы, закладзеныя вучоным у першых фундаментальных манаграфіях, далей толькі развіваліся і разгортваліся, што адкрывала перспектыўныя шляхі да далейшых адкрыццяў і поспехаў.

Неўзабаве ў грамадскім жыцці насталі перамены. Натуральна, і для навукі адкрыліся новыя далягляды. Плён працы ў гэтым кірунку выліўся ў напісанне аглядавых і прысвечаных творчасці аднаго аўтара артыкулаў па гісторыі беларускай драматургіі для шматкніжнай "Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя" ў 4 тамах (6 кнігах) – фундаментальнага даследавання літаратурнага працэсу Беларусі мінулага стагоддзя (1999–2015). Дарэчы, ідэйным натхняльнікам і арганізатарам праекта, па ўнікальнасці якому няма аналагаў у культурных дыскурсах суседзяў, з'яўляўся таксама Сцяпан Сцяпанавіч.

На такім трывалым падмурку была падрыхтавана доктарская дысертацыя пад назвай "Беларуская драматургія XX стагоддзя: асноўныя праблемы развіцця", паспяхова абароненая ў 1997 г.

Вынікам шматгадовай працы над гісторыяй беларускай драматургіі стала капітальная манаграфія "Гарызонты беларускай драматургіі" (2010). С. С. Лаўшук, пачынаючы ад самых вытокаў і заканчваючы пачаткам XXI ст., сістэматызаваў і канцэптуалізаваў станаўленне і развіццё айчынных п'ес. Іх абсяг дазваляе прадукаваць новыя ідэі і даследчыцкія адгалінаванні. Многія з іх знайшлі рэалізацыю ў дысертацыйных работах вучняў Сцяпана Сцяпанавіча і шматлікіх публікацыях.

Акрамя падагульняючых работ, С. С. Лаўшук рабіў адступленні ў творчасць паасобных аўтараў п'ес. Найбольшую ўвагу атрымаў Кандрат Крапіва. Яго п'есам прысвечана манаграфічнае даследаванне, якое перажыло тры выданні (1986, 2002, 2016) і ўрэшце пад назвай "Праз церніі да брамы неўміручасці" стала галоўнай падставай для прысуджэння прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (2017).

За гады працы над гісторыяй беларускай драматургіі назапашваўся і тэарэтычны багаж. І. Штэйнер адзначае, што С. С. Лаўшук упершыню ў беларускім літаратуразнаўстве звяртаецца да тэорыі драмы, пры гэтым "імкнецца пазбегнуць (хоць гэта не заўсёды ўдаецца) сацыялагізацыі аналізу, у цэнтры ўвагі заўсёды пакідае феномен эстэтычнага выяўлення жыццёвых канфліктаў і асэнсаванне спецыфікі драматургічнага ўвасаблення індывідуальных характараў, спалучаючы ў адзінае цэлае праблемы і агульна-крытычны разгляд матэрыялу". У выніку сістэматызацыі тэарэтычных роздумаў літаратуразнаўца таксама нарадзілася манаграфія "На драматургічных скрыжаваннях" (1989), дзе разглядаецца праблема спецыфікі эстэтычнага ўспрымання драматычных твораў чытачом і гледачом. С. С. Лаўшук аналізуе самыя розныя грані драматургічна-тэатральнага працэсу, не грэбуючы пры гэтым сацыялагічнымі падыходамі, дзе знаходзіцца месца як агульным даным, так і канкрэтным прыкладам. Несумненна, гэта работа адыграла важнейшую ролю ў свой час. Але яна па-ранейшаму застаецца прыкладам для пераймання, бо сёння падобных даследаванняў, відавочна, бракуе, што, зрэшты, і прадракалася самім аўтарам.

Калі ж апрача аднаасобна выкананых кніжных выданняў нагадаць зробленае С. С. Лаўшуком у рамках калектыўнай працы, дык толькі частковы пералік выкліча і здзіўленне, і, адпаведна, павагу. Прычым праблемны абсяг выходзіць за рамкі беларускай праблематыкі і не абмяжоўваецца літаратуразнаўствам. Пералічым асноўныя выданні: "История белорусской советской литературы" (1977), "Беларуская літаратура і праблемы сучаснасці" (1978), "Гісторыя беларускай савецкай літаратуры" (у 2 ч., 1981–1982), "На парозе 1990-х" (1993), "Нарысы па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязей" (у 4 кн., 1993–1995), "Гісторыя беларускай літаратуры, XIX – пачатак XX ст." (2-е выд., 1998), "Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў" (т. 2, 2007), «Тэатральная Беларусь» (т. 2, 2003), «Беларусы» (т. 13, «Тэатральнае мастацтва», 2012) і інш.

Як ацэнены вынікі літаратуразнаўча-даследчыцкай дзейнасці Сцяпана Сцяпанавіча? А гэта больш чым 300 навуковых публікацый, у тым ліку двухзначная лічба манаграфій. Зразумела, прынятымі ў навукова-адукацыйнай сферы рэгаліямі: у 1998 г. яму прысвоена званне прафесара, у 2004 г. – члена-карэспандэнта НАН Беларусі. У 2003 г. С. С. Лаўшук быў узнагароджаны знакам «Выдатнік друку Беларусі». Яшчэ праз год за вялікі ўклад у развіццё навукі і тэхнікі, паглыбленне даследаванняў у галіне фундаментальнай і прыкладной навукі, актыўную навукова-

арганізацыйную дзейнасць узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны. Не аднойчы вучоны быў узнагароджаны кіраўніцтвам Акадэміі навук за навуковую працу. Хаця Сцяпан Сцяпанавіч да падобнага ўшанавання адносіцца даволі спакойна, некаторымі ўзнагародамі ганарыцца і даражыць (ордэнам Францыска Скарыны, нагрудным знакам адрознення імя У. М. Ігнатоўскага Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, які быў прысуджаны ў 2021 г.). І гэта калі не лічыць паўтара дзясятка медалёў за грамадскую дзейнасць.

Пішучы пра навуковую і грамадскую дзейнасць С. С. Лаўшука, аўтары справядліва не прамінаюць вылучыць яго іпастась як арганізатара навукі і тэкстолага. За дзясяткі гадоў прафесійнага жыцця ён працяглы час кіраваў калектывамі, якія стварылі фундаментальныя даследаванні, важныя для беларускай гуманітарнай навукі.

Такія здольнасці заўважаліся кіраўніцтвам Акадэміі навук. З 1995 па 2007 г. Сцяпан Сцяпанавіч працаваў загадчыкам аддзела сучаснай беларускай літаратуры і крытыкі, пры гэтым з 1998 г. паралельна займаў яшчэ пасаду намесніка дырэктара інстытута па навуковай рабоце Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы.

Калегі ведаюць, што Сцяпан Сцяпанавіч лічыць найлепшым помнікам для кожнага пісьменніка яго збор твораў. Таму і тут зроблена нямала. Дастаткова згадаць пералік шматтомных збораў твораў: А. Макаёнка (у 5 т., 1987–1990); Кандрата Крапівы (у 6 т., 1997–2004); Івана Навуменкі (у 10 т., 2012–2017). Акрамя таго, С. С. Лаўшуком быў падрыхтаваны ладны томік твораў У. Галубка (1983). Трэба адзначыць, што такім жа чынам быў узнагароджаны Міхайла Грамыка, “Родную пушчу” якога (1987) ніхто б іншы не ўзгадаў. Факт наяўнасці багатай драматургіі ў дакастрычнікі час яскрава адлюстраваны ў манаграфіі “Беларуская дакастрычніцкая драматургія” (1978). Тут асобна адзначым заслугу С. С. Лаўшука ў вяртанні з нябыту і больш даўніх імён і твораў (напрыклад, п’есы Міхала Цяцерскага “Доктар па прымусу”, поўнага варыянта “Камедыі” Каятана Марашэўскага). Нельга не назваць выданні, адрасаваныя дзецям. Менавіта праз іх адкрылася наяўнасць у беларускай літаратуры багатай дзіцячай драматургіі: “П’есы” (1984), “Хлопчык у лесе” (1992), “Казкі для сцэны” (1995), “Цудоўная дудка” (1997) і інш. Шлях у друк п’ес для падрастаючага пакалення быў пракладзены: з 1990-х гг. кнігі з імі сталі выдавацца рэгулярна. Тыя, хто вывучаў прафесійны шлях Сцяпана Сцяпанавіча, адзначаюць не толькі колькасць зробленага ў галіне тэксталогіі, але і шчырую любоў вучонага да роднай літаратуры, нацыянальнай драматургіі і яе творцаў, імкненне захаваць, зберагчы ўсё лепшае, створанае майстрамі мастацкага слова, незвычайныя энтузіязм і самаадданасць.

З працы Сцяпана Сцяпанавіча як арганізатара навукі асобна можна вылучыць адгалінаванне мемарыялізацыі жыцця і дзейнасці выдатных вучоных, перадусім сваіх настаўнікаў і сяброў. Спачатку з’яўляліся асобныя артыкулы (пра Уладзіміра Няфёда, Васіля Івашына, Міхася Скрыпку, Івана Навуменку і інш.). Затым ініцыяваліся, укладаліся і часцей за ўсё рэдагаваліся самім С. С. Лаўшуком наступныя зборнікі ўспамінаў: “Жыццё не песціла мяне: успаміны пра Васіля Уладзіміравіча Івашына” (2013), “Дарыў святло сваёй душы людзям і Айчыне: успаміны пра Юльяна Сяргеевіча Пшыркова” (2015), “Летуценнасць і вялікія здзяйсненні: успаміны пра Івана Навуменку” (2017), “Скарбаў падземных шчаслівы шукальнік: успаміны пра Пятра Фёдаравіча Лысенку” (2023).

Пра дзейнасць Сцяпана Сцяпанавіча з нагоды яго ранейшых юбілеяў напісана ўжо нямала. Але толькі зрэдку нехта згадае пра такі важнейшы бок яго навуковага жыцця, як папулярызацыя дасягненняў беларускай навукі і культуры. У выніку ствараліся матэрыялы, якія пашыраліся па ўсёй Беларусі. Гэта, у прыватнасці, брашуры “З думкай пра сучасніка: Агляд сучаснай беларускай драматургіі” (1977), “Першы народны артыст БССР” (пра У. Галубка, 1982) і “Высокія арбіты грамадзянскасці” (пра А. Макаёнка, 1984). Важнай старонкай у біяграфіі С. Лаўшука з’яўляецца штогадовы ўдзел у навукова-асветніцкай экспедыцыі “Дарога да Святыняў”.

Адной з самых важных граней сацыяльнага жыцця Сцяпана Сцяпанавіча, несумненна, з’яўляецца педагагічная. Падрыхтоўку кадраў С. С. Лаўшук лічыць адным з прыярытэтных напрамкаў: кіраўніцтва кандыдацкімі дысертацыямі, работа намеснікам старшыні экспертнага савета № 7 ВАК Беларусі, членства ў савеце па абароне дысертацый пры Інстытуце літаратуразнаўства імя Янкі Купалы, прыём іспытаў у дзяржаўных экзаменацыйных камісіях. Многім

даследчыкам Сцяпан Сцяпанавіч даў пуцёўку ў навуковае жыццё. Толькі кандыдатаў філалагічных навук пры падтрымцы мэтра беларускай гуманітарыстыкі было падрыхтавана больш чым паўтара дзясятка.

Шмат часу на працягу 1990-х гг. С. С. Лаўшук прысвячаў студэнцкай аўдыторыі, перш за ўсё у alma mater. Акрамя таго, ён чытаў лекцыі па прадметах і вёў спецкурсы на малой радзіме – у ГДУ імя Францыска Скарыны, дзе таксама кіраваў дыпломнымі работамі, падрыхтаваў толькі для ГДУ трох кандыдатаў навук, у 1980-я гг. узначальваў кафедру беларускай літаратуры. Сёлетні юбіляр таксама прыклаў шмат намаганняў па стварэнні падручнікаў і навучальных дапаможнікаў па гісторыі беларускай літаратуры для філалагічных факультэтаў.

Адзначаючы грамадска-палітычную іпастась вучонага, дырэктар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі акадэмік А. І. Лакотка падкрэсліў, што С. С. Лаўшук шырока вядомы сваёй грамадскай дзейнасцю, у якой заўсёды праяўляў сябе чалавекам справядлівым, адказным, абавязковым і патрабавальным.

Сёння вучоны знаходзіцца ў выдатнай творчай форме. На падыходзе чарговыя навуковыя выданні і новыя абароны вучняў. Усё зробленае дазваляе казаць пра літаратуразнаўчую школу, сфраміраваную і ўзгадаваную С. С. Лаўшуком, школу, якая будзе мець працяг у наступных дзесяцігоддзях і стагоддзях, даследчыках і пакаленнях. Таму пажадаем чым даўжэйшага разгортвання ланцуга ўборыстага почырку Сцяпана Сцяпанавіча, а таксама яго зямнога чалавечага і даследчыцкага веку.

*А. В. Трафімчык*

**Інформация об авторе**

**Трофимчик Анатолий Викторович** – кандидат филологических наук, доцент, ведущий научный сотрудник. Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы, Национальная академия наук Беларуси (ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: anatol1976@gmail.com

**Information about the author**

**Anatolii V. Trophimchik** – Ph. D. (Philol.), Associate Professor, Leading Researcher. Center for the Belarusian Culture, Language and Literature researches of the National Academy of Sciences of Belarus (1 Surganov Str., Bldg 2, Minsk 220072, Belarus). E-mail: anatol1976@gmail.com